# ЧАКАНАЕ-ЖАДАНАЕ НАВАСЕЛЛЕ

**10 студзеня Нацыянальная бібліятэка Беларусі пачала пераезд у новае памяшканне. Першыя спецыяльныя кантэйнеры з кнігамі выгрузілі з вялізнага армейскага грузавіка. Яны размесцяцца ў выдатна абсталяваных сховішчах, сцелажах, пакоях.**



Загадчыца аддзела рэдкай кнігі Галіна КІРЭЕВА.





Да 31 студзеня ў новы будынак павінен пераехаць абменна-рэзервовы фонд бібліятэкі, а да 1 мая — больш за 8 мільёнаў друкаваных і рукапісных выданняў. А ўсе сховішчы новага будынка могуць змясціць больш як 14 мільёнаў кніг.

У апошнюю чаргу будуць перавезены асабліва каштоўныя старыя рарытэтныя выданні.

Асваенне новага будынка будзе праводзіцца паралельна з заключнымі будаўніча-мантажнымі работамі. Плануецца адкрыць у маі новыя чытальныя залы. Зараз ідзе працэс стварэння інфармацыйна-тэхналагічных сістэм, якія забяспечаць работу персаналу і абслугоўванне чытачоў.

Нацыянальная бібліятэка стане тэлекамунікацыйным і інфармацыйным вузлом карпаратыўнай бібліятэчнай сеткі краіны, будзе інтэгрыравана ў сусветную сістэму бібліятэк.

**Марыя ЖЫЛІНСКАЯ.**
**Фота аўтара.**